WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 САКАВІКА 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 42
(26906)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Таварышы афіцэры і генералы, паважаныя супрацоўнікі органаў унутраных спраў, дарагія ветэраны!

Ад усёй душы віншую вас з цудоўным святам — Днём міліцыі.

Суверэнітэт, сапраўдная незалежнасць дзяржавы забяспечваюцца спакойнай і ўпартай працай народа. Жыццё кожнага чалавека неаддзельнае ад жыцця краіны.

Ваша самаадданасць, высокая мера адказнасці і прафесіяналізм вызначаюць гатоўнасць органаў унутраных спраў эфектыўна забяспечваць правапарадак і грамадскую бяспеку, рэальна абараняць маёмасныя і сацыяльныя правы грамадзян, гарантаваныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Разам мы захавалі і ўмацавалі мір і стабільнасць, зберагліі Айчыну ад беспарадку і беззаконня. Ваша сіла — у яднанні з народам. Беларускія грамадзяне ўпэўненыя, што заўсёды знойдуць у вас дапамогу і падтрымку.

Дзяржава і грамадства высока цэняць вашу працу, адданасць Айчыне, вернасць абавязку і закону. Апраўдаць гэты давер — ваша галоўная задача.

Дзякую за службу Радзіме. Новых вам поспехаў у вашай адказнай дзейнасці ў імя працвітання Рэспублікі Беларусь.

Моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту вам і вашым блізкім.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

НА БАЗЕ ЗАТ «АТЛАНТ» ПЛАНУЕЦЦА СТВАРЭННЕ ХОЛДЫНГУ ПА ВЫТВОРЧАСЦІ СКЛАДАНАЙ БЫТАВОЙ ТЭХНІКІ

Гэта пытанне абмяркоўвалася 3 сакавіка падчас наведвання Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам гэтага прадпрыемства.

У гэты холдынг могуць увайсці некалькі буйных прадпрыемстваў, што вырабляюць бытавую тэхніку.

Ужо сёння ЗАТ «Атлант» фактычна з'яўляецца так званым змешаным холдынгам, сутнасць якога ў тым, што самае магутнае прадпрыемства адначасова з'яўляецца і кіруючай кампаніяй. У прыватнасці, ЗАТ «Атлант» пабудавала эфектыўную сістэму кіравання прадпрыемствамі, ствараючы цалкам падкантрольныя філіялы або дабіваючыся кантрольнага пакета ў прадпрыемствах, якія ствараюцца. У якасці філіялаў створаныя Баранавіцкі станкабудаўнічы завод, Завод бытавой тэхнікі па вытворчасці пральных машын. Заснаваныя ТАА «Белхол», ТАА «Атлант-Брокар», ТАА «Шапчыцы-Агра» і сумесныя прадпрыемствы ТАА «Атлант-СМ» у Смаленску, ТАА «Атлант-Сэрвіс» у Варшаве і АОЗТ «Атлант-Украіна» ў Кіеве. Галаўны завод — Мінскі завод халадзільнікаў — кіруе напрамую фінансамі філіялаў і праз сваю долю ў заснаваных прадпрыемствах.

Як было даложана кіраўніку дзяржавы, у цэлым «Атлант» з'яўляецца плацежаздольным і фінансава-ўстойлівым прадпрыемствам. Так, у цяперашні час у сярэднім на ЗАТ «Атлант» выпрацоўка на аднаго рабочага з улікам расходаў на сацыяльную сферу складае каля $62 тыс., а аналагічны паказчык на Заводзе бытавой тэхнікі па вытворчасці пральных машын дасягае 100 тыс. еўра. Фактычна створаныя вытворчасці нічым не саступаюць лепшым еўрапейскім аналагам.

Прадпрыемства рэалізуе сваю прадукцыю ў многія краіны свету. Акрамя краін СНД яна адгружалася ў Германію, Венгрыю, Латвію, Ізраіль, Літву, Манголію, Польшчу, Сербію, Славакію, Балгарыю, Аўстрыю, Нідэрланды, Італію, Швейцарыю, Эстонію і Францыю.

Прэзідэнт агледзеў вытворчую тэрыторыю прадпрыемства, у тым ліку прэсава-зварачны цэх, цэх пластмас і механазборачны цэх. Там гаворка ішла пра тэхнічнае пераўзбраенне і рэканструкцыю як аснову павышэння эканамічнай эфектыўнасці работы. Таксама была звернутая ўвага на імпартазамяшчэнне пры правядзенні тэхнічнага пераўзбраення і рэканструкцыі.

Стварэнне холдынгаў на базе буйных прамысловых прадпрыемстваў Беларусі будзе прадоўжана. Так, ЗАТ «Атлант» ужо з'яўляецца свайго роду холдынгам па вытворчасці «белай» тэхнікі (халадзільнікі, маразільнікі, пральныя машыны і інш.). У сваю чаргу на базе «Гарызонта» створаны холдынг па вытворчасці «чорнай» тэхнікі (аўдыя-, відэатэхніка, ЗВЧ-печы і інш.). Актыўна развіваецца і сумеснае прадпрыемства «Мідэа-Гарызонт», створанае з удзелам кітайскага інвестара.

Таксама разглядаецца магчымасць стварэння холдынгаў на базе МАЗа, БелАЗа, Мінскага маторнага завода, МТЗ, БАТЭ, Амкадора. Не выключана, што ў працэсе стварэння холдынгавых структур змогуць прыняць удзел і замежныя інвестары.

У цэлым, працэс стварэння холдынгаў — гэта загад часу. Справа ў тым, што невялікім прадпрыемствам складана канкураваць ва ўмовах сучасных рэалій на сусветным рынку. Таму неабходна стварацьмагутныя структуры, здольныя выпускаць і прасоўваць на рынках канкурэнтаздольную прадукцыю. Акрамя таго, холдынгі дазваляюць сканцэнтраваць інжынерны патэнцыял, больш актыўна праводзіць навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія работы, аблягчаюць прыцягненне сродкаў для развіцця і мадэрнізацыі вытворчасці, дазваляюць арганізаваць якасную падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў службовых асоб, што стварэнне холдынгаў павінна мець пад сабой глыбокую эканамічную аснову і дакладныя фінансава-эканамічныя разлікі.

Паводле паведамлення прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работніцы брыгады № 2 сталічнага ЖЭС-88 спяшаюцца на ранішнюю ўборку гарадскіх вуліц.

ГАСПАДЫНІ ЧЫСТАГА ГОРАДА

АЛЯКСАНДР РАДЗЬКОЎ ПАДЗЯКАВАЎ АКТЫВІСТАМ БРСМ ЗА ПАДТРЫМКУ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ НА ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАХ

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр РАДЗЬКОЎ падзякаваў актывістам БРСМ за падтрымку кандыдатуры Аляксандра Лукашэнкі ў час прэзідэнцкіх выбараў 2010 года на сустрэчы з актывам гэтай арганізацыі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Як кіраўнік выбарчага штаба Аляксандра Лукашэнкі хачу падзякаваць актывістам БРСМ за работу ў час выбараў. Яны былі вельмі актыўныя, удзельнічалі ў пікетах, працавалі з душой, адкрыта», — сказаў Аляксандр Радзькоў. Ён падкрэсліў, што маладыя людзі падтрымалі праграму Прэзідэнта і яго кандыдатуру, таму што ведаюць аб выніках яго дзейнасці на пасадзе кіраўніка дзяржавы, бачаць, як паспяхова развіваецца краіна, якія магчымасці адкрываюцца для моладзі: знайсці работу, зарабляць, забяспечваць сям'ю, атрымаць кватэру, займацца бізнэсам або дзяржаўнай дзейнасцю.

На думку першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі, моладзь БРСМ літаральна «стаяла гарой за Прэзідэнта». Паводле яго слоў, часам ім даводзілася «процістаяць нападкам і правакацыям» прыхільнікаў іншых кандыдатаў, але ўсё ж актывісты БРСМ змаглі «даказаць перавагі праграмы Аляксандра Лукашэнкі, абапіраючыся на рэальныя вынікі яго дзейнасці».

Аляксандр Радзькоў перакананы, што вопыт работы ў час прэзідэнцкіх выбараў спатрэбіцца хлопцам і дзяўчатам з БРСМ у будучым, паколькі не за гарамі выбарчая кампанія па выбарах у парламент. «Гэта загартоўка, гэта ваша грамадзянская пазіцыя, гэта вопыт, які спатрэбіцца», — сказаў ён, дадаўшы, што вопыт работы структур БРСМ на выбарах 2010 года варта прааналізаваць і ўлічыць памылкі і поспехі пры рабоце на парламенцкіх выбарах 2012 года.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ПАДАРАЖЭЎ БЕНЗІН

Канцэрн «Белнафтахім» зацвердзіў новыя адпускныя і рознічныя цэны на нафтапрадукты.

З учарашняга дня рознічная цана на бензін «Нарваль-80» павысілася да 2,4 тысячы рублёў за 1 літр, літр бензіну AI-92 ужо каштуе 3 тысячы рублёў, літр бензіну AI-95 і AI-95-Еўра — 3400, а літр дызельнага паліва — 2 850 рублёў.

У канцэрне патлумачылі, што павышэнне цэн на ўнутраным рынку краіны выклікана ростам сусветных цэн на нафту і павелічэннем ставак акцызаў на падакцызныя нафтапрадукты, у сувязі з чым эфектыўнасць рэалізацыі нафтапрадуктаў на ўнутраным рынку значна пагоршылася. Акрамя таго, у «Белнафтахіме» паведамілі пра часовае прыпыненне рэалізацыі праз АЗС біядызельнага паліва ў сувязі з неўражаем летась рапсу і значным скарачэннем аб'ёму вытворчасці рапсавага алею.

Ігар ГРЫШЫН.

БЫЛІ СМЯРОТНА ТРАЎМАВАНЫЯ

На аўтамагістралі Кобрын—Гомель непадалёку ад в. Любачын (Лунінецкі раён) вадзіцель ААТ «Ванет», жыхар г. Гомеля, раманаваў аўтамабіль «МАН».

Падчас рамонту рухавік сарваўся з дамката, і чалавек быў смяротна траўмаваны. А ў лесе каля в. Лядзец (Столінскі раён) загінуў рабочы мясцовага лясгаса. У час нарыхтоўкі драўніны на яго ўпала дрэва.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СУСЕДКА ВЫРАТАВАЛА ДВАІХ ДЗЕТАК

Увечары ў Слуцкае раённае падраздзяленне МНС паведамілі пра пажар у жылым доме ў вёсцы Мялешкі. Тэлефанавала суседка.

Да прыбыцця выратавальнікаў-пажарных гэтая ж жанчына выратавала дваіх дзетак: хлопчыка 2003 года нараджэння і дзяўчынку 2006 года нараджэння. Яны не пацярпелі. У выніку пажару пашкоджана столевае перакрыцце, закураная маёмасць на кухні і ў цагляным доме. На момант ўзнікнення пажару маці дзяцей знаходзілася на падворку, займалася гаспадарчымі справамі. З моманту выяўлення задымлення ўнутры жылля яна знаходзілася ў шокавым стане. Прычынай пажару, як мяркуецца, стала шчыліна ў коміне печкі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Анатоль ТОЗІК:

Зала калегіі

«Усмешка ці добрае слова ўрача не патрабуюць ніякіх выдаткаў»

— Дэпапуляцыя насельніцтва з'яўляецца глабальнай праблемай, якую проста недапушчальна ігнараваць, — такую думку выказаў на пасяджэнні выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль ТОЗІК. — Нам трэба зрабіць усё магчымае і немагчымае, каб спыніць далейшае скарачэнне насельніцтва. Шляхі выпраўлення дэмаграфічнай сітуацыі вам усім добра вядомыя: гэта рост нараджальнасці, зніжэнне смяротнасці, павелічэнне працягласці жыцця. Вы толькі ўдумайцеся: за 10 гадоў мы страцілі 1 мільён нашых грамадзян. І калі нам не ўдасца пераламіць сітуацыю, то праз 100 гадоў беларусаў ужо ўвогуле не будзе. Паглядзіце толькі на лічбы за мінулы год. Яны проста ашаламляюць: 2407 чалавек загінулі ў выніку выпадковых атручэнняў алкаголем, 1185 — у дарожна-транспартных здарэннях, 2474 — у выніку самазабойстваў, 1485 — сталі ахвярамі злачынстваў, 1110 беларусаў загінулі на пажарах, 1104 — патанулі, 232 — загінулі на вытворчасці. Амаль 10 тысяч абсалютна неапраўданых смерцяў з пункту погляду здаровага сэнсу! Гэта насельніцтва цэлага раённага цэнтра!!!

Закранаючы пытанні фінансавання сістэмы аховы здароўя, віцэ-прэм'ер папрасіў звярнуць увагу ўсіх прысутных на рацыянальнае выкарыстанне тых сродкаў, што выдзяляюцца з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў:

— Бюджэт ніколі не зможа прафінансаваць усе патрэбы аховы здароўя ў поўнай меры, таму шукайце ўнутраныя рэзервы. Звярніце ўвагу на дэбюракратызацыю сістэмы кіравання. Гэта сёння наша агульная задача. Я абяцаю вам падтрымку ўрада ў вырашэнні праблемы дэцэнтралізацыі паўнамоцтваў. Пагадзіцеся, што кіраўнікі клінік, паліклінік лепш за іншых ведаюць, як размеркаваць і засвоіць тыя рэсурсы, што выдзяляюцца на ўтрыманне ўстаноў аховы здароўя. За апошнія 10 гадоў мы набылі медыцынскай тэхнікі і абсталявання на сотні мільёнаў долараў. Многія нашы клінікі аснашчаныя не горш за еўрапейскія. Аднак ці заўсёды мы можам забяспечыць эфектыўнасць выкарыстання дарагой тэхнікі? Нярэдка мы спачатку закупляем дарагое абсталяванне, а толькі затым вырашаем, дзе яно будзе стаяць і хто на ім будзе працаваць. А павінна быць усё наадварот: кадры, якія змогуць абслугоўваць новую тэхніку, павінны рыхтавацца яшчэ падчас правядзення тэндару на яе набыццё. Нам трэба падумаць над тым, каб таленавітых выпускнікоў медыцынскіх ВНУ адпраўляць на стажыроўку ў Еўропу: на месяц, два, тры, чатыры...

— Я пяць апошніх гадоў правёў у Кітаі і магу патлумачыць вам, чаму гэта краіна рушыць апошнія 30 гадоў наперад фантастычнымі тэмпамі, — дадаў Анатоль Тозік. — Там усе пытанні вырашаюцца, зыходзячы са здаровага сэнсу: заканадаўства, нарматыўныя акты, любыя рашэнні хутка падганяюцца пад здаровы сэнс. А мы, наадварот, здаровы сэнс падганяем пад напісаную 10 гадоў назад інструкцыю. Я хацеў бы патлумачыць усім, чаму сёлетні год стаў Годам прадпрымальнасці, а не, скажам, годам прадпрымальніцтва або годам ініцыятывы. Калі мы ва ўрадзе вырашалі, як гэты год назваць, то звярнуліся да слоўніка: прадпрымальнасць азначае не толькі ініцыятыўнасць, але і здольнасць да ажыццяўлення справы, якая прыносіць поспех. Мы ўсе майстры агучваць ініцыятывы. Але мала толькі ініцыяваць, трэба яшчэ і паспяхова рэалізоўваць гэтыя ініцыятывы. Мы абыходзім многія краіны па колькасці ўрачоў на 10 тысяч насельніцтва. А дзе эфект? Прэзідэнт паставіў перад урадам канкрэтныя задачы — гэта якасная падрыхтоўка кадраў, разумная іх расстаноўка, максімальна эфектыўнае выкарыстанне, стымуляванне зацікаўленасці ў выніках працы.

Прабачце, але я не магу не закрануць яшчэ адну балючую для вас тэму — стаўленне ў нашых лячэбных установах да пацыентаў. Пагадзіцеся, што мы прыходзім да ўрача не ў самыя вясёлыя моманты свайго жыцця. Скажу банальную рэч, але тым не менш: няўжо так цяжка ўсміхнуцца людзям, якія прыйшлі да вас па дапамогу, пахлопаць іх па плячы, неяк іх падбадзёрыць, заспакоіць? Магу сцвярджаць на ўласным прыкладзе, што калі яшчэ ўрач з табой у калідоры паліклінікі павітаецца, то ад медыцынскай сястры ты ніколі гэтага не дачакаешся. Між іншым, усмешка ці добрае слова ўрача не патрабуюць ніякіх выдаткаў. Ці я не маю рацыі?

Сапраўдныя авацыі залы віцэ-прэм'ер сарваў, калі агучыў сваё бачанне вырашэння праблемы перагрузак амбулаторна-паліклінічнага звяна.

— Навошта мы вымушаем нашых людзей звяртацца ў паліклінікі па кожную даведку? Чаму б не даць чалавеку з лёгкай прастудай ці насмаркам магчымасць палячыцца дома? Я мяркую, кіраўнік установы можа дазволіць свайму работніку прапусціць пару дзён па прычыне хваробы? — звярнуўся да прысутных Анатоль Тозік. — Магчыма, і чэргі ў паліклініках, нарэшце, знікнуць?

Трэба патлумачыць, што ў некаторых замежных краінах у хворых з прастудай ёсць законнае права проста адляжацца некалькі дзён дома без фармальнага звароту да ўрача (калі прастуда не суправаджаецца ўскладненнямі, то ўсе, у прынцыпе, ведаюць, як з ёй змагацца). Галоўнае — паведаміць аб гэтым свайму наймальніку. У нашай краіне гэта таксама практыкуецца прыватнымі фірмамі. Але, вядома, для таго, каб распаўсюдзіць такую практыку на ўсе арганізацыі, яе трэба заканадаўча ўрэгуляваць. Медыкі, калі меркаваць па рэакцыі залы калегіі, не супраць. Цяпер слова — за урадам?

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Аб іншых праблемах, што ўзніклі на выніковай калегіі, чытайце ў бліжэйшых нумарах «Звязды».)

ДАІ гатова да «транспартнага буму»

Аб гэтым і не толькі паведамілі ў ДАІ МУС Беларусі.

Рэзкага павелічэння колькасці транспарту, які рэгіструецца, у сувязі з размовамі аб магчымым павышэнне мытных збораў падраздзяленні ДАІ сёння не адчуваюць.

— У рэспубліцы 37 падраздзяленняў, якія займаюцца рэгістрацыяй транспарту, — адзначыў **старшы інспектар УДАІ МУС Дзмітрый ГАРЫНОВІЧ**. — І нягледзячы на тое, што прырост транспартных сродкаў у Рэспубліцы Беларусь назіраецца штогод, яны з нагрузкай спраўляюцца. У прыватнасці, у Мінску ў дзень праводзіцца не менш як 1000 аперацый па зняцці з уліку і рэгістрацыі транспарту. Таму нават калі раптам рэзка павялічыцца колькасць аўтамабіляў, якія ўвозяцца ў краіну, нашы падраздзяленні будуць гатовы ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны іх рэгістраваць.

Сістэма відэафіксацыі запрацуе на поўную магутнасць пасля тэхнічнай дапрацоўкі

Паводле слоў **намесніка начальніка УДАІ МУС Максіма ПАДБЯРОЗКІНА**, зараз сістэма відэафіксацыі на трасе М1/Е30 функцыянуе на 15-20 % ад сваёй магутнасці. Гэта звязана з тым, што яшчэ ёсць шэраг тэхнічных момантаў, якія патрабуюць дапрацоўкі.

— Мы разумеем, што калі ў поўным аб'ёме запусцім сістэму сёння, то могуць узнікнуць збоі ў яе рабоце, што, у сваю чаргу, выкліча нараканні з боку грамадзян. Мы не можам гэтага дапусціць, таму запусцім яе толькі пасля таго, як будзем на 100 працэнтаў перакананыя ў яе канчатковай тэхнічнай дапрацоўцы. — Пры гэтым намеснік начальніка УДАІ МУС паабяцаў, што аб пачатку работы сістэмы відэафіксацыі ў паўнавартасным рэжыме ДАІ папярэдзіць грамадзян загадзя. Больш за тое, назаве ўчасткі, дзе камеры ўсталяваныя.

Надзея ДРЫЛА.

Сёння — Дзень беларускай міліцыі

АРГАНІЗАВАНАЯ ЗЛАЧЫННАСЦЬ ЦІКАВІЦЦА «ЖЫВЫМІ КАШТОЎНАСЦЯМІ»

Арганізаваная злачыннасць уласцівая практычна ўсім краінам і народам, розным гістарычным этапам: руская злачынная арцель, японская «якудза» або «баракудан», якая з'явілася ў 1612 годзе, сіцылійская мафія, якая, паводле некаторых ацэнак, узнікла ў 1670 годзе і разнавіднасцю якой стала амерыканская коза-ностра... Галоўная мэта ўсіх гэтых утварэнняў — устанаўленне непадзельнага кантролю за ўсімі злачыннымі фінансавымі плынямі і размеркаваннем прыбытку, атрыманага ў выніку злачыннай дзейнасці. Адсюль з'яўленне «наглядальнікаў», «трымальнікаў абшчаку», так званых «аўтарытэтаў» крымінальнага свету.

Чым багацейшая краіна, тым больш фінансавых сродкаў уцягваецца ў гандлёва-грашовае абарачэнне, і тым больш арганізаваны злачынны свет жадае «ўрваць свой кавалак пірага». Невыпадкова ў апошнія гады назіраецца тэндэнцыя стварэння транснацыянальных злачынных арганізацый, кансалідацыя злачынных згуртаванняў у межах цэлых рэгіёнаў, у тым ліку ў межах Еўрасаюза. Слабаразвітыя краіны, краіны «трэцяга свету» — Лацінская Амерыка, Афрыка, Сярэдняя Азія, з'яўляюцца пры гэтым, калі гаварыць пра наркабізнэс ці гандаль людзьмі, у асноўным пастаўшчыкамі сыравіны або «жывога тавару», а спажыўцамі выступаюць менавіта развітыя краіны. Самы буйны спажывец гераіну — Еўропа. Штогод на еўрапейскім кантыненце ў выніку ўжывання наркотыкаў і псіхатропаў, нават па самых сціплых ацэнках, гіне каля 40 тысяч маладых людзей. Пры гэтым самыя вялікія прыбыткі асядаюць у найбольш багатых краінах прызначэння. Паводле экспертных ацэнак, увесь сусветны рынак гандлю наркотыкамі складае 72 млрд долараў. Пра месца і ролю беларускіх праваахоўных органаў у супрацьдзеянні падобным з'явам расказвае начальнік галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Алег ШАРКОЎ.

— Дзякуючы якаснай і эфектыўнай дзейнасці беларускіх праваахоўнікаў, у тым ліку прэвентыўнай працы, скіраванай на недапушчэнне працэсаў кансалідацыі ў крымінальным асяродку, у краіне за апошнія гады не дапушчана адкрытых формаў праяўлення арганізаванай злачыннасці, мінімізаваны яе ўплыў на працэсы, якія маюць месца ў крымінальным асяроддзі. Так, калі ў 2001 годзе за стварэнне злачыннай арганізацыі або ўдзел у ёй па краіне было заведзена 8 крымінальных спраў і 14 — за бандытызм, то ў 2005-м — адпаведна 28 і 7, а ў 2010-м — 8 і 2. Згодна з рэспубліканскай статыстыкай па крымінальных справах, папярэдняе расследаванне па якіх завершана, колькасць злачынстваў, здзейсненых у складзе арганізаваных груп, знізілася з 455 у 2009 годзе да 388 у 2010-м, прычым іх удзельная вага ад агульнай колькасці расследаваных злачынстваў склала ўсяго 0,4 працэнта.

28 сакавіка галоўнаму ўпраўленню па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Рэспублікі Беларусь спаўняецца 20 гадоў. Падраздзяленні ўпраўлення ёсць ва ўсіх абласных і 15 буйных рэгіянальных гарадах краіны.

СТАР. 2

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.03.2011 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼ 1 долар ЗША	3 018,00	1 чэшская крона	172,30	USD	28,3228
▲ 1 еўра	4 180,53	1 польскі злоты	1 051,53	10 UAH	35,6419
1 латвійскі лат	5 930,44	▲ 1 расійскі рубель	106,56	1000 BYR	9,3753
1 літоўскі літ	1 210,10	1 украінская грыўня	379,84	EUR	39,2752

ISSN 1990 - 763X

8 САКАВІКА БУДЗЕ МАРОЗНА

Аб гэтым БЕЛТА паведаміла начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла ПАРАШЧУК.

У суботу ў многіх раёнах пройдзе снег, чакаецца мяцеліца. У дзённыя гадзіны месцамі ў Віцебскай вобласці магчымы моцны снег. Тэмпература паветра ноччу складзе 2—9 градусаў марозу. Днём ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. У нядзелю чакаецца паніжэнне тэмпературы. Чакаецца снег, месцамі мяцеліца. На дарогах галалёдзіца, магчымы моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе мінус 3—10, днём ад нуля да 7 марозу. У панядзелак, 7 сакавіка, тэмпература паветра мінус 8—15 градусаў. Па поўначы краіны яна панізіцца да 18 градусаў марозу, днём не перавысіць мінус 2—8 градусаў, па захадзе прагназуецца каля нуля.

А 8 сакавіка надвор'е будзе знаходзіцца пад уплывам антыцыклону, будзе пераважна без ападкаў. Ноччу месцамі магчымы туман, шэрань. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе мінус 10—17 градусаў, пры праясненнях яна панізіцца да мінус 18—22 градусаў. Днём прагназуецца нуль — мінус 6 градусаў. Па захадзе Гродзенскай і Брэсцкай абласцей паветра прагрэецца да плюс 2 градусаў. 9 і 10 сакавіка таксама захаваецца марознае надвор'е.

Абітурыент-2011

ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ «СТАРТУЕ» З ПАПЯРЭДНЯГА ПРАФАДБОРУ

5 сакавіка ў краіне распачнецца рэгістрацыя абітурыентаў для праходжання прафесійна-псіхалагічнай гутаркі. Прайсці яе абавязаны будуць усе абітурыенты, якія плануюць паступаць на спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне», «Дзяржаўнае кіраванне і права», «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «Міжнародныя адносіны», «Міжнародныя права», «Правазнаўства», «Эканамічнае права», «Журналістыка», «Міжнародная журналістыка» і «Мытная справа».

Варта мець на ўвазе, што праз папярэдні прафадбор павінны прайсці ўсе, хто плануе паступаць на завочную, вячэрнюю, дыстанцыйную формы навучання, на паралельнае навучанне, на навучанне ў скарочаныя тэрміны, на навучанне на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, для атрымання другой і наступнай вышэйшай адукацыі як за кошт сродкаў бюджэту, так і на ўмовах аплаты фізічнымі і юрыдычнымі асобамі. Гэта значыць, што праходзіць гутарку пры паступленні на спецыяльнасць «Правазнаўства» давядзецца ўсім абітурыентам прыватных ВНУ. Прызёрам і пераможцам абласной і рэспубліканскай алімпіяды, калі яны вырашаць паступаць на вышэйпералічаныя спецыяльнасці, таксама трэба атрымаць рэкамендацыю да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі ад спецыяльнай камісіі па правядзенні прафесійна-псіхалагічнай гутаркі.

Ад праходжання прафесійна-псіхалагічнай гутаркі вызваляюцца толькі замежныя грамадзяне, якія плануюць паступаць у беларускія ВНУ, але пражываюць за межамі нашай краіны (у тым ліку і расіяне). Аднак замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, павінны такую гутарку прайсці.

Абітурыент мае права прайсці гутарку па кожнай групе спецыяльнасцяў, напрыклад, для паступлення на спецыяльнасць «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» і «Эканамічнае права». Аднак абітурыентам катэгарычна забараняецца рэгістравацца на адну і тую ж спецыяльнасць (групу спецыяльнасцяў) у розных ВНУ. Прайсці такую гутарку можна толькі адзін раз.

Сёлета ў працэдуру правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі былі ўнесены невялікія карэкціроўкі. Летась абітурыенты сутыкаліся з сітуацыяй, калі пасля праходжання гутаркі па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і права» яны не маглі падаваць свае дакументы для паступлення на спецыяльнасць «Правазнаўства». І наадварот, «правазнаўцы» не мелі права паступаць на спецыяльнасць «Дзяржаўнае кіраванне і права».

Рэгістрацыя грамадзян для ўдзелу ў прафесійна-псіхалагічнай гутарцы будзе весціся з 5 па 31 сакавіка на падставе іх асабістых заяў. Пасля 31 сакавіка заявы прымацца ўжо не будуць. Заява можа быць пададзена грамадзянінам асабіста ці быць накіраванай па пошце. У першым выпадку будучы абітурыент асабіста прад'яўляе пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць яго асобу. А пры адпраўленні па пошце да заявы дадаецца копія пашпарта ці іншага дакумента, які сведчыць асобу. Адказнасць за правільнасць і праўдзівасць звестак, пазначаных у заяве, ускладаецца на грамадзяніна. Грамадзяніну, які падаў заяву для ўдзелу ў гутарцы, паведамяць месца і час яе правядзення асабіста ці па пошце.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Пералік вышэйшых навучальных устаноў — месцаў правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі ў 2011 годзе

Дзяржаўнае кіраванне, дзяржаўнае кіраванне і эканоміка:
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны
Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. Шамякіна
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна
Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны

Міжнародныя адносіны, міжнароднае права:
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут
Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносін
БІП — Інстытут правазнаўства

Дзяржаўнае кіраванне і права, правазнаўства, эканамічнае права:
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія
Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносін
Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут
Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва
БІП — Інстытут правазнаўства
Мінскі інстытут кіравання

Журналістыка, міжнародная журналістыка:
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва

Мытная справа:
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту

Заўвага: *рэгістравацца і праходзіць гутарку можна ў любой ВНУ, указанай у пераліку, незалежна ад таго, куды будзе паступаць абітурыент.*